Дзяржаўная ўстанова адукацыі
“Казялужская сярэдняя школа”

Майстар-клас

# Выкарыстанне заданняў па лексіцы для фарміравання трывалых ведаў, уменняў і навыкаў малодшых школьнікаў у падрыхтоўцы да алімпіяды па беларускай мове і літаратуры

Зарэніна Надзея Аляксееўна,
настаўнік пачатковых класаў
вышэйшай катэгорыі

Тэма: Выкарыстанне заданняў па лексіцы для фарміравання трывалых ведаў, уменняў і навыкаў малодшых школьнікаў у падрыхтоўцы да алімпіяды па беларускай мове і літаратуры.

Мэта: арганізацыя актыўнага педагагічнага ўзаемадзеяння для вывучэння адукацыйнага патэнцыялу заданняў па вывучэнні лексікі на ўроках, стымулюючых занятках для фарміравання трывалых ведаў, уменняў і навыкаў малодшых школьнікаў у падрыхтоўцы да алімпіяды па беларускай мове і літаратуры.

Задачы:

пазнаёміць удзельнікаў майстар-класа з магчымасцямі выкарыстання заданняў па лексіцы для падрыхтоўкі да алімпіяды па беларускай мове:

стварыць умовы для фарміравання вопыту ўдзельнікаў майстар-класа ў выкарыстанні творчых лексічных заданняў;

садзейнічаць далейшай самаадукацыі і прафесійнаму самаўдасканаленню ўдзельнікаў майстар- класа ў выкарыстанні заданняў па лексіцы на першай ступені навучання як адной з эфектыўных форм падрыхтоўкі да алімпіяды па беларускай мове.

Абсталяванне: прэзентацыя, мульцiборд.

Ход майстар-класа

I. Арганізацыйна-матывацыйны этап.

- Добры дзень, паважаныя калегі! Я вітаю вас на майстар-класе “Выкарыстанне заданняў па лексіцы для фарміравання трывалых ведаў, уменняў

і навыкаў малодшых школьнікаў  у падрыхтоўцы  да алімпіяды па беларускай мове і літаратуры”. Жадаю вам плённа і творча сёння папрацаваць. Спадзяюся на вашу актыўнасць і прашу ў вас падтрымкі для сябе, за што буду вельмі ўдзячна!

II. Інфармацыйна-дзейнасны этап.

Работу з высокаматываванымі навучэнцамі трэба арганізоўваць у адпаведнасці з іх патрэбамі і магчымасцямі. Заняткі праводзяцца з мэтай развіцця пазнавальнай актыўнасці дзяцей, іх інтэлэктуальных здольнасцей, паглыблення і сістэматызацыі ведаў па ўсіх раздзелах мовазнаўства. Так пры вывучэнні раздзела “Лексіка” новыя словы мэтазгодна ўводзіць тэматычнымі блокамі, запісваючы іх на дошцы з пастаноўкай націску і перакладам на рускую мову. Настаўнік паказвае ілюстрацыі, тлумачыць значэнне і паходжанне слоў, якія вывучаюцца на занятках, вызначае прыналежнасць да радавога ці відавога паняцця. На гэтым этапе важна навучыць дзяцей правільна ўжываць новыя словы.

Напрыклад, арганізаваць работу са словамі тэматычнай групы “Ягады” можна наступным чынам. Спачатку трэба запісаць на дошцы і ў сшытках назвы ягад, побач - пераклад: клубнІцы, трУскаўкі, трУскаўкі-клубника; чарнІцы-черника; сунІцы-земляника; журавІны- клюква; бруснІцы- брусника; ажЫны-ежевика; агрЭст- крыжовник; парЭчкі- смородина; абляпІха-облепиха; кавУн-арбуз; малІны-малина. Для лепшага запамінання дэманструюцца выявы ягад, каб дзеці навучыліся адрозніваць, напрыклад, журавіны ад брусніц, чарніцы ад парэчак. Таксама неабходна прыгадаць, калі і дзе паспяваюць ягады, якія маюць густ, водар, колер, памер. Прапануецца рабятам выказаць здагадкі аб паходжанні назвы і звярнуць увагу на несупадзенне ліку ў беларускай і рускай мовах. Потым патрэбна скласці і запісаць у сшытку тры-пяць сказаў з назвамі ягад.



Падчас працы са слоўнікавымі словамі, напрыклад *дождж*, вызначаецца яго прыналежнасць да тэматычнай групы “З’явы прыроды”. Настаўнік прапануе

вучням назваць з’явы прыроды, якія яны ведаюць (*навальніца, гром, снег, дождж, туман і г.д.)*. Абавязкова прыводзяцца фразеалагізмы з гэтымі словамі: як гром з яснага неба, дождж за шыю не лье, напускаць туману. Для замацавання новага матэрыялу можна прапанаваць наступныя заданні.

1. Падбярыце аднакаранёвыя словы да слова дождж (*дажджлівы, дажджынка,дажджавы, дажджавік).*
2. Закончыце фразеалагізмы словам дождж.
   З вялікага грому*…( малы дождж);*
   Быццам грыбы*…(пасля дажджу);*
3. Злучыцце часткі прыкмет: ластаўкі нізка лятаюць*…(дождж будзе);* адкуль хмары*,…(адтуль дождж*); будзе дождж-…(*будуць і грыбы).*

Значную ролю ў падрыхтоўцы вучняў да ўдзелу ў алімпіядзе адыгрывае займальная лінгвістыка. З мэтай павышэння пазнавальнага інтарэсу вучняў і развіцця іх творчых здольнасцей, лагічнага мыслення і кемлівасці мэтазгодна прапанаваць заданні, распрацаваныя на аснове прыказак, фразеалагізмаў, загадак і г.д. Дзеці вельмі любяць разгадваць крыжаванкі, рэбусы, анаграмы, метаграмы і г.д. Іх можна дапоўніць граматычнымі заданнямі. Напрыклад:

1. Адгадайце метаграму. Да слоў-адгадак падбярыце па тры аднакаранёвых словы.
   Звярок я рыжанькі, лясны,
   У казках, байках я бываю,
   Адну мне літару змяні-
   Я ўвосень з дрэва ападаю.
   *(Ліса-ліст; лісяня, лісіны, лісічка; лісце, лісцік, ліставы)*
2. Адгадаце метаграму. У словах адгадках падкрэсліце літары, якія абазначаюць цвёрдыя зычныя гукі:
   З “е” - дружу з будаўнікамі, з “а” - купляй у хлебнай краме.
   *( бетон-батон).*
3. Запішыце назоўнікі, якія атрымліваюцца, калі прачытаць дадзеныя словы зправа налева па гуках:
   рог, нарад, лёс, кот, лета, краб, нос.
   *(Хор, таран, соль,ток, атэль, парк,сон).*

III. Рэфлексія вынікаў сумеснай дзейнасці.

Метад “Воблачкі”.

Паважаныя калегі! Калі вам спадабаліся заданні, прапанаваныя мною, падыміце, калі ласка, блакітныя воблачкі, калі не – сінія. Дзякуй вам за вашу актыўную працу і падтрымку.



